В.А.Касап, Р.А.Ровіна

**Бібліяграфічныя дапаможнікі па прыродазнаўчых навуках**

Агляд бібліяграфічнай прадукцыі прыродазнаўчай тэматыкі, выдадзенай на працягу 1991-95 гг., сведчыць, што найбольш важкія бібліяграфічныя дапаможнікі выйшлі пад эгідай ЦНБ імя Я.Коласа АН Беларусі.

Перш за ўсё трэба адзначыць чарговыя выпускі паказальнікаў, якія прысвечаны жывёльнаму і расліннаму свету рэспублікі. Паказальнік "Животный мир Беларуси" (447(1992 г.)) змяшчае звесткі аб дакументах на беларускай і рускай мовах за 1985-89 гг. Паказальнік часткова анатаваны За гэты ж перыяд часу адлюстроўвае літаратуру і другі паказальнік "Флора и растительность Белоруссии" (430(1992 г.)).

Сярод фундаментальных дапаможнікаў неабходна адзначыць выданы ў 1992 г. паказальнік "Природа Беларуси" (166(1992 г.), 468(1994 г.), 502(1995 г.)), у якім у сістэматычным парадку адлюстраваны каля 2,5 тыс. кніг, аўтарэфератаў, матэрыялаў канферэнцый, сходаў, сімпозіумаў на беларускай і рускай мовах. Наступныя выпускі паказальніка рыхтуюцца ў аўтаматызаваным рэжыме.

Акрамя гэтых традыцыйных для бібліятэкі дапаможнікаў, у 1992 г упершыню ў рэспубліцы быў надрукаваны шматгаліновы паказальнік "Естественные науки. Техника. Сельское хозяйство. Медицина" (165(1992 г.)), у якім паказаны выдадзеныя на тэрыторыі рэспублікі кнігі з 1861 па 1917 год.

Значнае месца ў масіве дапаможнікаў належыць персанальным паказальнікам. Асноўная маса іх надрукавана ў часопісах "Дифференциальные уравнения", "Журнал прикладной спектроскопии", "Вестник Белорусского государственного университета" і інш., а таксама ў кнігах адпаведнага зместу, што можна разглядаць як станоўчы фактар. Сярод такіх дапаможнікаў можна адзначыць "Список научных трудов А.В.Бицадзе" (235(1991 г.)), "Список избранных научных трудов В.М.Матросова" (359(1993 г.)), "О научном наследии А.С.Ахматова" (534(1993 г.)) і інш.

Як і ў галіне тэхнікі, дастаткова вялікае развіццё атрымала публікацыя аглядаў літаратуры на сучасных актуальных праблемах у перыядычных выданнях. Такія агляды характэрны для ўсіх галінаў прыродазнаўчага комплексу ((668(1994 г.), 705(1994 г.), 685(1995 г.)) і інш.

Бягучае інфармаванне спецыялістаў ажыццяўлялася шляхам выпуску анатаваных паказальнікаў. Так, на працягу разглядаемага перыяду, штоквартальна з 1990 г. выходзіў паказальнік "Программные средства учебного назначения" (180,948(1992 г.), 316, 364(1993 г.)), с 1978 г. (па паўгоддзях) "Аннотированный библиографический указатель литературы по гидрологии" (518(1991 г.), 386(1992 г.), 728(1993 г.)) і штомесячна "Информационно-библиографический указатель новых поступлений документов" (519(1991 г.), 338(1992 г.)).

В.А.Касап, Р.А.Ровіна

**Бібліяграфічныя дапаможнікі па медыцыне**

У параўнанні з другімі галінамі народнай гаспадаркі медыцына параўнальна недрэнна забяспечана інфармацыйнай прадукцыяй, у тым ліку і

бібліяграфічнымі дапаможнікамі. За 1991-1995 годы з друку выйшла больш за 100 розных відаў паказальнікаў. У іх складанні прымалі ўдзел Рэспубліканская навуковая медыцынская бібліятэка (РНМБ), Беларускі цэнтр навуковай медыцынскай інфармацыі (БелЦНМІ), бібліятэкі медыцынскіх вышэйшых вучэбных устаноў і навукова-даследчых інстытутаў.

У патоку прадстаўлены ўсе віды бібліяграфічнай прадукцыі: бягучыя, рэтраспектыўныя, рэкамендацыйныя і прафесійна-вытворчыя бібліяграфічныя паказальнікі. Акрамя таго складаліся і інфармацыйныя выданні: аглядная інфармацыя, рэферыраваныя часопісы і экспрэс-інфармацыйныя.

Большая частка бібліяграфіі - гэта тэматычныя паказальнікі і спіскі літаратуры. На другім месцы галіновыя выданні, паказальнікі твораў супрацоўнікаў НДІ. Паказальнікі пераважна выдадзены асобна, каля 10 з іх з'яўляюцца ўнутрычасопіснымі, ці ўнутрыкніжнымі.

Характэрнай асаблівасцю бібліяграфічных дапаможнікаў з'яўляецца адлюстраванне зарубежнай літаратуры з прыцягненнем разнастайных баз даных РНМБ.

Добрай традыцыяй з'яўляецца падрыхтоўка бібліяграфічных спісаў да міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцый, з'ездаў урачоў, напрыклад, да з'езду кардыёлагаў.

Нягледзячы на дастаткова вялікую колькасць выдадзеных бібліяграфічных паказальнікаў, адчуваецца зніжэнне іх колькасці па гадах. Калі ў 1991 г. іх было 42, то ў 1995 г. - каля 10. Найбольшая колькасць паказальнікаў была складзена па ўнутраных хваробах, найменшая - па фізіялогіі і неўрапаталогіі.

З метадычнага погляду ўся інфармацыйная прадукцыя знаходзіцца на добрым узроўні. Вытрыманы патрабаванні ДАСТ 7.1-84 "Библиографическое описание документа. Общие требования и правила составления" (М., 1984) да апісання розных відаў дакументаў, у тым ліку і на замежных мовах. Матэрыял часцей за ўсё групуецца па тэмах, а ў інфармацыйным бюлетэні "Медико-биологические аспекты аварии на Чернобыльской АЭС" (792(1992 г.), 837(1993 г.), 1192(1994 г.)) - у сістэматычным парадку ў адпаведнасці з спецыяльна распрацаваным рубрыкатарам праблемна - арыентаванай базы даных "Медыцынскія аспекты аварыі на Чарнобыльскай АЭС", а ў рэфератыўнай частцы зборнікаў - па рубрыкатару ГАСНТІ.

У паказальніках перыядычных выданняў (1014(1991 г.), 766(1992 г.), 816(1993 г.), 1137(1994 г.), 913-14(1995 г.)), якія выпісвае Рэспубліканская навуковая медыцынская бібліятэка, матэрыял размяшчаецца ў алфавіце. Ёсць прыклад размяшчэння бібліяграфіі па відах выданняў, напрыклад, паказальнік "Семейный врач" (875(1993 г.)).

У рэтраспектыўных паказальніках матэрыял адлюстроўваецца ў асноўным за 3-6 гадоў (напрыклад, "Страховая медицина" (782(1992 г.)), "Хозяйственный расчет в здравоохранении" (768(1992 г.)), "Лечение острых лейкозов" (1030(1995 г.))і інш.). За 1991-1995 гг. складзены толькі адзін паказальнік, у якім матэрыял адлюстроўваецца за 10 гадоў - гэта "Медицина катастроф" (850(1993 г.)).

√Відавы склад уключаных у дапаможнікі дакументаў у асноўным традыцыйны - гэта кнігі, артыкулы з перыядычных выданняў, матэрыялы канферэнцый. Дастаткова рэдка адлюстроўваюцца аўтарэфераты (за выключэннем "Медицина катастроф") і іншыя віды дакументаў, напрыклад, патэнтная дакументацыя.

Заслугай ўсіх паказальнікаў з'яўляецца тое, што разам з бібліяграфічным апісаннем дакументаў, якія захоўваюцца ў РНМБ, праставуляецца шыфр захоўвання. А ў рэфератыўных зборніках праставуляецца нумар рэферата і спасылка на інфармацыйнае выданне, якое паслужыла крыніцай выяўлення дакументаў.

У інфармацыйных выданнях (рэфератыўных, аглядных паказальніках) раскрываецца змест кожнага дакумента. У бібліяграфічных паказальніках ён раскрываецца выбарачна ў выглядзе даведачных і рэкамендацыйных анатацый, ці з дапамогай указання на аспекты зместу, напрыклад, указанне назваў гарадоў. З метадычнага пункту гледжання не да канца адпрацаванымі з'яўляюцца праблемы дакладнага вызначэння віду інфармацыйнага прадукту. Аднолькавыя па колькасці ўключаных дакументаў, па спосабах групоўкі дапаможнікі называюцца ў адных выпадках паказальнікамі ("Питание и радиация" (944(1995 г.)), у другіх - спісам ("Преодоление" (781(1992 г.)). Вялікая колькасць аналітычных аглядаў, якія складзены ў пачатку 90-х гадоў, носяць назву "Справки".

Пошукавыя магчымасці большасці бібліяграфічных паказальнікаў і спісаў павялічыла б выкарыстанне нумарацыі ўключаных дакументаў і стварэнне дапаможнага апарата. Адлюстраванне ў паказальніках больш шырокага кола пярвічных дакументаў, напрыклад, дэпаніраваных рукапісаў, аўтарэфератаў дысертацый, патэнтнай дакументацыі прыдало б ім яшчэ большае значэнне.

У цэлым трэба адзначыць, што дзякуючы актыўнай дзейнасці арганізацый - складальнікаў інфармацыйнай прадукцыі, карыстальнікі медыцынскай інфармацыі маюць магчымасць атрымаць аператыўную, у рознай ступені паўнаты адлюстравання, бібліяграфічную інфармацыю па актуальных праблемах медыцыны.

В.А.Касап, Р.А.Ровіна

## Бібліяграфічныя дапаможнікі па тэхніцы

Аналіз бібліяграфічнай прадукцыі па тэхніцы за апошнія пяць гадоў дае падставу сцвярджаць, што колькасць бібліяграфічных паказальнікаў па розных галінах тэхнікі паступова змяншаецца. Звязана гэта, па-першае, з цяжкай сацыяльна-эканамічнай сітуацыяй, па-другое, з укараненнем аўтаматызаваных тэхналогій.

Сярод створаных дапаможнікаў - бібліяграфічныя паказальнікі, спісы літаратуры, агляды, нязначная колькасць рэкамендацыйных паказальнікаў.

Бягучае інфармаванне спецыялістаў асобных галін ажыццяўляецца штомесячнымі, штоквартальнымі і іншай перыядычнасці спісамі новых паступленняў ў інфармацыйныя фонды. Сярод іх можна назваць анатаваныя пералікі розных відаў дакументаў, якія паступілі ў фонды розных бібліятэк, органы інфармацыі. Напрыклад, "Перечень конструкторско-технологической документации, имеющейся в фонде БелНИИНТИ" (621(1991 г.), 479(1992 г.), 1015(1993 г.), "Список информационных материалов, научно-технической литературы и ГОСТов, поступивших в отдел НТИ БелНИИтоппроект" (650(1991 г.), 501(1992 г.), 1016(1993 г.)).

Сярод фундаментальных паказальнікаў перш за ўсё звяртае на сябе ўвагу дапаможнік "Чарнобыль" (1028(1993 г.), 1163(1995 г.)), у падрыхтоўцы якога прымалі ўдзел усе буйнейшыя бібліятэкі рэспублікі - НББ, ЦНБ імя